Весці БДПУ. Серыя 2. 2022. № 2. С. 88–95

УДК 334.722.2:631(091)"18/19"(476+474.5)

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ТАВАРЫСТВАЎ У БЕЛАРУСІ І ЛІТВЕ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

**Р. Мадатаў,**
*аспірант аддзела гісторыі Беларусі і Новага часу НАН Беларусі*

UDC 378.014.24(510:477)(091), 1992/2021

# SOCIAL-ECONOMICAL ACTIVITY OF AGRICULTURAL COMMUNITIES IN BELARUS AND LITHUANIA (THE END OF THE 19th – THE BEGINNING OF THE 20th CENTURY)

**R. Madatau,**
*Postgraduate Student of the Department of History of Belarus and Modern Time, NAS of the Republic of Belarus*

Паступіў ў рэдакцыю 26.01.22.

Received on 26.01.22

У артыкуле акрэслены асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў. Устаноўлены напрамкі і формы дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў. Выяўлена, што сацыяльна-эканамічная дзейнасць таварыстваў мела чатыры ключавыя напрамкі і розныя формы, якія дазволілі таварыствам стварыць устойлівую сістэму падтрымкі землеўласнікаў у рэгіёне, адносна развітую матэрыяльную базу і актывізаваць сацыяльна-эканамічныя сувязі паміж рознымі групамі насельніцтва. Гэта прывяло да інтэнсіфікацыі сацыяльна-эканамічнага развіцця на землях Беларусі і Літвы ў канцы XIX – пачатку XX ст.

*Ключавыя словы:* сельскагаспадарчыя таварыствы, сацыяльна-эканамічная дзейнасць, статут, Беларусь, Літва.

The article emphasizes the main directions of social-economical activity of agricultural communities. It establishes the directions and forms of activity of agricultural communities. Social-economical activity of the communities had four main directions and different forms which allowed the communities to create a stable system of supporting landlords in the region, a relatively developed material base, and to activate social-economical connections between different groups of population. This resulted in intensification of social-economical development in the territories of Belarus and Lithuania in the end of the 19th – the beginning of the 20th century.

*Keywords:* agricultural communities, social-economical activity, statute, Belarus, Lithuania.

*Уводзіны.* Таварыствы сельскай гаспадаркі (ТСГ) з'яўляюцца прыкметнай і адметнай з'явай у сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Таварыствы пастаянна імкнуліся ўзмацняць матэрыяльную базу і павышаць узровень даверу з боку насельніцтва, абапірацца на мясцовых землеўласнікаў і мець падтрымку царскага ўраду. Мэта была адна – стымуляваць эканамічную і грамадскую ініцыятыву ў краі.

Ідэя стварэння губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў у беларуска-літоўскіх губернях пачала рэалізоўвацца ў сярэдзіне 1870-х гг. Стварэнне ТСГ расцягнулася на чвэрць стагоддзя (1876–1901 гг.) і праходзіла ў 2 этапы: на першым этапе (1876–1879 гг.) былі створаны усходнебеларускія ТСГ – Мінскае (1876 г.), Віцебскае (1876 г.) і Магілёўскае (1879 г.); на другім этапе (1899 – 1901 гг.) – заходнебеларускія і літоўскія Віленскае (1899 г.), Ковенскае (1900 г.) і Гродзенскае (1901 г.).

Структура кіраўніцтва таварыстваў супадала ва ўсіх шасці губернях. Для лепшага ахопу губерняў з дазволу генерал-губернатара ствараліся павятовыя аддзелы губернскіх ТСГ і аўтаномныя сельскагаспадарчыя павятовыя таварыствы. У 1910-я гг. колькасць павятовых сельскагаспадарчых аб'яднанняў перавысіла рубеж у 25 таварыстваў. Напачатку XX ст. сталі ствараць аб'яднанні на ўзроўні адной або некалькіх валасцей, сярод іх былі як сельскагаспадарчыя таварыствы, так і земляробчыя гурткі, яны былі аўтаномны ў вядзенні справаводства і мелі ўласнае кіраўніцтва, але падтрымлівалі шчыльны кантакт з павятовымі (пры наяўнасці таварыства ў канкрэтным павеце) і губернскімі таварыствамі. Стварэнню шырокай сістэмы валасных сельскагаспадарчых аб'яднанняў (больш за 100 валасных таварыстваў і гурткоў на 1915 г.) спрыяла сталыпінская аграрная рэформа, пачатак якой нездарма супаў з пашырэннем валасных сельскагаспадарчых аб'яданняў на тэрыторыі Беларусі. Колькасць членаў у губернскіх таварыствах складала ад 200 да 500 чал., у павятовых таварыствах, каля 50 чал., у валасных таварыствах вагалася ад 20 да 40 чал. [26].

Арганізацыйнае станаўленне сельскагаспадарчых таварыстваў у Беларусі і Літве было абумоўлена шэрагам знешніх і ўнутраных фактараў. Адным з галоўных фактараў была інтэнсіўнасць паўстанцкай барацьбы з царызмам у 1863–1864 гг. З пункту погляду ўладаў Расійскай імперыі, усходнія губерні былі больш «дабранадзейныя», таму і ТСГ там з'явіліся значна раней.

Палітычная лібералізацыя часоў рэвалюцыі 1905–1907 гг., якая падштурхнула і да сацыяльна-эканамічных змен у краі, такіх як увядзенне земстваў і правядзенне сталыпінскай аграрнай рэформы, не магла не адбіцца на дзейнасці сельска-гаспадарчых таварыстваў.

Падчас Першай сусветнай вайны Гродзенскае таварыства сельскай гаспадаркі (ГродзТСГ) выехала ў эвакуацыю ў цэнтральную Расію, Ковенскае таварыства сельскай гаспадаркі (КовТСГ) і Віленскае таварыства сельскай гаспадаркі (ВілТСГ) дзейнічалі ва ўмовах нямецкай акупацыі, МагТСГ з 1916 г. не спраўлялася з абавязкамі і фактычна перадала іх земству Магілёўскай губерні, а ВіцТСГ і МінТСГ працягвалі дзейнасць як самастойныя арганізацыі.

Вялікі ўклад у вывучэнне сацыяльна-эканамічнай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў у Беларусі і Літве зрабіў Р. Юркоўскі [1, s. 15–30], закранаў дадзенае пытанне таксама А. Раманоўскі [3, s. 265–275]. А. Л. Кіштымаў даследваў выставачную дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў [4], а Н. Я. Новік адукацыйна-асветніцкую дзейнасць [13]. Комплексна сацыяльна-эканамічная дзейнасць таварыстваў разглядалася толькі Р. Юркоўскім [1].

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца высвятленне і ацэнка вынікаў сацыяльна-эканамічнай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў у Беларусі і Літве.

## Прававыя асновы сацыяльна-эканамічнай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў

Прававой асновай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў быў статут сельскагаспадарчага таварыства. Статут сельскагаспадарчага таварыства зацвярджаўся землярobчым ведамствам (Міністэрствам дзяржаўных маёмасцей (1876–1894), Міністэрствам земляробства і дзяржаўных маёмасцей (1894–1905), Галоўным упраўленнем землеўладкавання і земляробства (1905–1915), Міністэрствам земляробства (1915–1917).

Першым прынятым «беларускім» статутам быў зацверджаны, 20 ліпеня 1876 г. статут Віцебскага таварыства сельскай гаспадаркі а ўжо праз месяц, 20 жніўня 1876 г., зацвердзілі статут Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, у 1879 г. – Магілёўскага таварыства сельскай гаспадаркі, у 1899 г. – Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі, у 1900 г. – Ковенскага таварыства сельскай гаспадаркі, і ў 1901 г. – Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі. У зацверджаныя статуты маглі ўносіцца змяненні і дапаўненні. Варта адзначыць, што 30 чэрвеня 1897 г. урадам быў зацверджаны ўзорны, тыпавы статут сельскагаспадарчых таварыстваў.

Структурна статуты сельскагаспадарчых таварыстваў падзяляліся на параграфы, якія ўтваралі блокі са скразной нумарацыяй. Першы блок быў своеасаблівай прэамбулай: у першым параграфе прапісвалася мэта стварэння сельскагаспадарчага таварыства, далей прадстаўляліся задачы і апісваліся спосабы іх рэалізацыі, пералічваліся правы і абавязкі членаў таварыства.

Параўноўваючы статуты Віцебскага таварыства сельскай гаспадаркі ад 20 ліпеня 1876 г. [29], статут Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі ад 20 жніўня 1876 г. [30], тыпавы статут сельскагаспадарчых таварыстваў ад 30 чэрвеня 1897 г. [14], статут Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі ад 27 красавіка 1899 г. [28], паспрабуем акрэсліць прававое поле, вызначыць агульныя прававыя рамкі, а таксама прававыя адметнасці ў дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў.

Згодна са статутам Віцебскага таварыства сельскай гаспадаркі, мэтай сельскагаспадарчага таварыства з'яўляецца згуртаванне асобаў, якія займаюцца і цікавяцца сельскай гаспадаркай для сумеснай дзейнасці. Вынікам дасягнення гэтай мэты павінна было стаць развіццё сельскай і лясной гаспадаркі, а таксама прамысловасці, заснаванай на перапрацоўцы прадукцыі сельскай гаспадаркі. Віцебскае таварыства сельскай гаспадаркі таксама імкнулася палегчыць для землеўласнікаў рэалізацыю сельскагаспадарчай прадукцыі і прыём на працу сельскагаспадарчых рабочых [29, с. I].

У статуце Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі прапісвалася наступная мэта: даследванне ўмоў і праца па паляпшэнні мясцовай сельскай гаспадаркі, развіццё лясной гаспадаркі і сельскагаспадарчай прамысловасці. Вызначаўся вялікі шэраг задач: пошук найвыгоднейшых спосабаў вядзення сельскай і лясной гаспадаркі; вышукванне мер да паляпшэння сельскай гаспадаркі і сельскай прамысловасці таксама і для землеўласнікаў, якія не належалі да таварыства [30, с. 3–7].

У тыпавым (узорным) статуце сельскагаспадарчых таварыстваў 1897 г. прадпісвалася спрыяць мясцовым гаспадарам у набыцці патрэбнай сельскагаспадарчай прадукцыі і прыладаў працы, збыце прадукцыі па выгадным кошце і, калі патрэбна, перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны, выдачы пазык пад за-

клад тавараў і атрыманні пазык ад крэдытных устаноў [14, с. 319–325].

У статуце Віленскага таварыства сельскай гаспадаркі ставілася наступная мэта: спрыяць сіламі сваіх членаў развіццю і ўдасканаленню сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчай прамысловасці. Ставіліся задачы вывучэння становішча ў розных галінах сельскай гаспадаркі і высвятлення гаспадарчых патрэб шляхам сумеснага абмеркавання [28, с.1–5].

Такім чынам, згодна са статутамі, сельскагаспадарчыя таварыствы ствараліся для таго, каб палепшыць стан сельскай гаспадаркі, інтэнсіфікаваць сельскагаспадарчую вытворчасць, спрыяць згуртаванню ўсіх зацікаўленых у гэтым асоб. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі ставіла сабе за мэту дапамагаць усім землеўласнікам Мінскай губерні, а не толькі членам таварыства, якія рабілі грашовыя складкі. Тыпавы статут вызначаў асноўнай мэтай таварыстваў дапамогу сельскаму гаспадару ў атрыманні крэдытаў на развіццё гаспадаркі. У выніку на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў з'явіліся грамадскія арганізацыі, якія атрымалі паўнамоцтвы і пэўную свабоду дзеянняў у сацыяльна-эканамічнай сферы.

У адпаведнасці са статутам былі пытанні, якія адносіліся да ўнутранай кампетэнцыі таварыстваў, і пытанні, якія патрабавалі санкцыі органаў улады.

Да ўнутранай кампетэнцыі таварыстваў адносіліся распаўсюджванне ў губерні сельскагаспадарчых машын, прылад працы; набыццё з першых рук пародзістага быдла, коней, вупражы, насення і іх далейшы продаж членам таварыства і жыхарам губерні па льготных коштах, абмеркаванне пытанняў справядлівага коштаўтварэння. Таварыства само вырашала, каму выдаваць пахвальныя лісты, прызначаць грашовыя прэміі і медалі [29, с. III–IV].

Таварыствы мелі права самастойна весці гандлёва-фінансавую і крэдытную дзейнасць, у межах якой забяспечваць выгодную рэалізацыю прадукцыі землеўласнікаў і выдачу ім крэдытаў [14, с. 319–325]. Яны маглі ладзіць сельскагаспадарчыя з'езды для распаўсюджвання аграномічных ведаў і абмену вопытам [28, с. 1–5]. Маглі збіраць статыстычныя звесткі, якія адносіліся да сельскай гаспадаркі. Без папярэдняй цэнзуры маглі друкавацца спецыяльныя гаспадарчыя выданні, якія патрабавалі тэрміновай публікацыі. За іх публікацыю персанальна адказваў старшыня таварыства [14, с. 319–325].

Да пытанняў, якія не маглі вырашацца без дазволу органаў улады, адносілася: стварэнне доследных або ўзорных устаноў, арганізацыя публічных лекцый для распаўсюджвання рацыянальнай гаспадаркі. Усе сельскагаспадарчыя таварыствы падпарадкоўваліся ўраду, праз які яны і хадатайнічалі пра свае патрэбы і куды штогод прадстаўлялі справаздачы [29, с. III–IV].

Атрыманне дазволу таксама было неабходна для арганізацыі сельскагаспадарчых экспедыцый, для вывядзення новых гатункаў раслін і парод жывёл, для арганізацыі і правядзення выстаў (з аўкцыённым продажам ці без яго) сельскагаспадарчай прадукцыі і прылад, на адкрыццё і ўтрыманне складоў для продажу прылад працы, машын, насення, угнаенняў, а таксама іншых прадуктаў і прадметаў, патрэбных насельніцтву, на адкрыццё ўстаноў меліяратыўнага крэдыту [30, с. 3–7].

Дазвол патрабаваўся таксама на набыццё рухомай і нерухомай маёмасці ў Расійскай імперыі і за мяжой (стварэнне кантор, складоў, крамаў і агенстваў), на публікацыі ў афіцыйных дзяржаўных выданнях і мясцовых легальных газетах [14, с. 319–325], на выданне ўласнага часопіса [30, с. 3–7]. Дазвол патрабаваўся на выданне журналаў сходу таварыства, справаздач, апытальных аркушоў і праграм па зборы звестак, якія ўваходзяць у сферу дзейнасці таварыства, дзейнасць таварыстваў па вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі і інш. [28, с. 1–5].

Такім чынам, да кампетэнцыі таварыстваў адносіўся шэраг пытанняў, але статут быў пабудаваны так, каб была пастаянная справаздачнасць і камунікацыя з земляробчым ведамствам.

Усе пералічаныя ў статутах аспекты сацыяльна-эканамічнай дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў можна падзяліць на напрамкі:

1. Практычная дзейнасць па ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці: найм павятовых інструктараў, распаўсюджванне новых гатункаў раслін, сельскагаспадарчых культур і парод жывёлы, стварэнне складоў з сельскагаспадарчымі прыладамі і насеннем.
2. Страхавыя, крэдытныя і гандлёва-фінансавыя аперацыі.
3. Адукацыйная і асветніцкая дзейнасць: навучальныя ўстановы, курсы, экскурсіі, перыядычны друк, бібліятэкі, музеі.
4. Навукова-доследная праца: экспедыцыі, узорныя гаспадаркі, доследныя ўстановы.
5. Выставы і конкурсы.

### Практычная дзейнасць па ўдасканаленні сельскагаспадарчай вытворчасці

Сярод членаў МагТСГ было шмат прадпрымальных людзей. Маёнтак «Дзяніскавічы» ў Рагачоўскім павеце належаў Івану Мельнікаву. У 1904 г. ён меў 55 малочных кароў, якіх здаваў у арэнду па 12 руб. за адну жывёлу, атрымліваючы 660 руб. Таксама 310 рублёў памешчык атрымліваў за малочныя прадукты і цялят, сумарна 970 руб. Утрыманне ж кароў каштавала 2255 руб. Такім чынам, гаспадарка

была стратнай. Выдаткі перавышалі прыбыткі на 1285 руб. Тады ў 1907 г. І. Мельнікаў завёў 62 племянныя каровы, надоі выраслі на 12 %, і ўпершыню гаспадарка стала прыносіць прыбытак [12, с. 31].

Скардзячыся на адсталасць жывёлагадоўлі, карэспандэнт «Могилевской земской недели» пісаў: «У Еўропе і Амерыцы лічыцца, што тая карова аплочвае корм, якая дае на год не менш за 200 вёдраў малака. У нас жа нават у параўнальна лепшых гаспадарках за рэдкім выключэннем гадавы надой кароў складае 80–100, а ў сялян – 60–80 вёдраў». Каб паскорыць паляпшэнне жывёлагадоўлі, у студзені 1910 г. па ініцыятыве МагТСГ была створана секцыя жывёлагадоўлі [12, с. 30]. МагТСГ спрыяла паляпшэнню сельскай гаспадаркі праз набыццё ангельмскай пароды кароў, якія былі найлепш адаптаваны да прыродных умоў Магілёўскай губерні. Сапраўдны член МагТСГ Юліян Бехлі (пасля быў членам павятовых камісій Магілёўскай губерні падчас выбараў ва Устаноўчы сход ) меў маёнтак у Чавускім павеце. Ён меў вялікую колькасць кароў, надой за 1909 г. склаў 6200 пудоў малака, з іх 6000 пайшло на выраб масла і 200 пудоў на выраб тварагу і смятаны [15, с. 15].

ВілТСГ стварыла склад, дзе захоўваліся сельскагаспадарчыя машыны. Арганізоўваліся пракатныя пункты прылад працы і машын. Дзейнічаў інструктар па земляробчых гуртках, інструктар кантроль-саюзаў (здзяйсняў ацэнку якасці прадукцыі для продажу). Фінансаванне ішло інструктару па малочнай гаспадарцы, інструктару па паляводстве [1, с. 318–372].

ГродзТСГ праводзіла меліяратыўныя працы на землях землеўласнікаў таварыства, адзначаўся высокі ўзровень кваліфікацыі інжынера-меліяратара К. Б. Шэміёта [7].

У студзені 1903 г. Ковенскі губернскі камітэт падтрымаў ідэю павелічэння колькасці інструктароў па розных галінах пры ТСГ і іх дадатковае субсідаванне. Аднак паколькі меншая частка землеўласнікаў губерні ўваходзіла ў ТСГ, а інструктары мусілі атрымліваць дазвол на дапамогу іншым землеўласнікам ад таварыства і пытанне членства вызначалася тымі ж членамі ТСГ, было вырашана стварыць пасады інструктароў па розных галінах гаспадаркі для актыўнай дапамогі не толькі членам ТСГ, але і іншым землеўласнікам [10, с. 1–17].

Важна адзначыць, што з 1906 па 1917 г. практычая дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў ажыццяўлялася ва ўмовах правядзення сталыпінскай аграрнай рэформы. Значную ролю ў асэнсаванні П. Сталыпіным неабходнасці рэформы адыграла знаходжанне яго на пасадах Ковенскага губернскага маршалка дваранства і губернатара Гродзенскай губерні. У заходняй частцы Беларусі існавала падворная форма гаспадарання, якая стымулявала прыватную ініцыятыву. Мясцовае КовТСГ ад моманта свайго стварэння (1900 г.) заявіла пра імкненне да пашырэння новых метадаў вядзення гаспадаркі і распаўсюджання ведаў сярод землеўласнікаў. Для гэтага ствараліся павятовыя і валасныя сельскагаспадарчыя таварыствы, актыўна прасоўвалася ідэя пра ўвядзенне земстваў у заходніх губернях. П. А. Сталыпін, як губернскі маршалак дваранства быў у курсе спраў КовТСГ, бо гэтыя пытанні падымаюцца ў яго асабістай перапісцы з кіраўніцтвам Ковенскага таварыства сельскай гаспадаркі (А. А. Мейштовічам і А. А. Азнабішыным) [23, 24]. Таму ковенска-гродзенскі перыяд жыцця П. А. Сталыпіна аказаў пэўны уплыў на яго погляды і часткова прадвызначыў яго прыхільнасць да ідэі шырокай хутарызацыі і разбурэння сельскай грамады.

### Страхавыя, крэдытныя і гандлёва-фінансавыя аперацыі

У 1877 г. ВіцТСГ спрыяла стварэнню кадастра землеўласнікаў Віцебскай губерні для раўнамернага абкладання іх грашовымі зборамі. У межах гэтай рэформы члены ВіцТСГ прынялі актыўны ўдзел у люстрацыйных мерапрыемствах, калі былі створаны вопісы маёмасці землеўласнікаў Віцебскай губерні. 16 верасня 1880 г. з ініцыятывы і пры падтрымцы ВіцТСГ было створана Таварыства ўзаемнага крэдыту землеўласнікаў Віцебскай губерні, колькасць членаў якога на 1903 г. дасягнула 659 чалавек, а грашовае абарачэнне 11 961 051 руб. З прыбыткам у 14 827 руб. [11, с. XXX–XXXV].

МінТСГ у 1881 г. стварыла першае на тэрыторыі губерні пазыкова-ашчаднае таварыства з цэнтрам у Клецку, якое таксама называлі «Клецкім банкам». Гэта ўмацоўвала аўтарытэт МінТСГ і падвышала папулярнасць Эдварда Вайніловіча як намесніка старшыні таварыства ў Мінскай губерні [3, с. 267].

ВіцТСГ распрацавала план па далучэнні да дамовы Паўночнага страхавога таварыства з МінТСГ аб страхаванні маёмасці на выпадак пажару [8]. У справаздачах таварыства прыводзіліся звесткі аб атрыманні працэнтаў ад прыбытку Таварыства ўзаемнага крэдыту землеўладальнікаў Віцебскай губерні, дывідэндаў ад Мінскага агентства Паўночнага страхавога таварыства.

У 1905 г. ВіцТСГ узяло свабодны крэдыт на закупку абсталявання для ніжэйшай сельскагаспадарчай школы ў Лужэсне (Віцебскага павету). Крэдыт быў прадастаўлены намеснікам старшыні ВіцТСГ Міхаілам Рыкам у Таварыстве ўзаемнага крэдыту землеўласнікаў Віцебскай губерні [21]. Старшыня ВіцТСГ Аляксандр Хвастоў дамогся стварэння пры ВіцТСГ

ВДПУ

гандлёва-прамысловага сіндыката [11, с. XXX–XXXV].

ВілТСГ стварыла Віленскі прыватны камерцыйны банк і Камісійнае бюро, якое выконвала замовы землеўласнікаў за пэўную аплату. У Ковенскай губерні добра функцыянавала сістэма дробнага крэдыту. На 1903 г. дзейнічала 29 пазыкова-ашчадных таварыстваў з 14 473 членамі, са штогадовай выдачай пазык на суму 2 490 873 руб. і паступленнямі на складкі ў памеры 1 143 422 руб., а на пазыкі 715 766 руб. [10, с. 1–17].

У 1894 г. МагТСГ перамагло ў конкурсе на права заключыць дамовы падраду аб забеспячэнні войска хлебам. Ажыццяўляліся пастаўкі хлеба для войскаў, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі беларускіх губерняў. МагТСГ і надалей прадпрымаліся спробы пошуку новых рынкаў збыту для сельскагаспадарчай прадукцыі Магілёўскай губерні.

На пачатку XX ст. МагТСГ быў адкрыты ў Кіеве склад малочных прадуктаў з мэтай палегчыць збыт малака, масла і сыру. У Рагачоўскім павеце з 1904 па 1910 г. існавала асобная секцыя па малочнай гаспадарцы, якая мела свайго раз'езнага спецыяліста [12, с. 31]. МагТСГ і земства Магілёўскай губерні ажыццяўляла пасрэдніцтва ў справе набыцця прыладаў працы членамі таварыства [18].

## Асветніцкая дзейнасць і навукова-доследная праца

МінТСГ і яго членамі фундавалася стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчых школ розных профіляў. У Мінскай губерні з 1876 г. дзейнічала Мар'іна-Горская ніжэйшая сельскагаспадарчая школа першага разраду, якую пачынаючы ад 1880-х гг. фінансава падтрымлівалі некаторыя члены МінТСГ. Таксама ў Бабруйскім павеце дзейнічала Пятровіцкая школа пладаводства і хмеляводства другога разраду, створаная ў 1884 г. і з 1895 г. Бабруйская школа садаводства, агародніцтва і хмеляводства [5].

Згодна са статутам, МінТСГ дазвалялася далучаць жанчын да навучання ў сельскагаспадарчых школах. У 1899 г. было створана Таварыства садзейнічання жаночай сельскагаспадарчай адукацыі, з якім шчыльна ўзаемадзейнічала МінТСГ. На пачатку XX ст. МінТСГ таксама стварыла камісію па жаночай сельскагаспадарчай адукацыі [13].

Добрым прыкладам эксперыментальнай узорнай гаспадаркі ў Мінскай губерні з'яўляецца хутар «Бабоўня» ў Слуцкім павеце. У 1905 г. З. Трускаляскі арганізаваў паказальны хутар на чатырох дзесяцінах спустошанай зямлі, выкапаў студню і завёў сад. Хутар не меў ні выгана, ні пожні. Уся хутарская зямля была падзелена на чатыры палі. Вясной 1906 г. быў дадзены старт чатырохпольнаму севазвароту, пры гэтым ніводнае з палёў не выкарыстоўвалася як паша ці луг. У 1905 г. зямля адпачывала. У 1906 г. засявалася па палях адпаведна 1 – жытам, 2 – лубінам, 3 – аўсом з канюшынай, 4 – вікай і бульбай. У 1907 г. пачынаецца акуратны пладазмен 1 – бульба і віка, 2 – жыта (па лубіне), 3 – канюшына, 4 – авёс з канюшынай. Такім жа чынам севазварот працаваў і ў наступныя гады. У выніку з 1909 г. З. Турускаляскі пачаў атрымліваць больш за 18 руб. прыбытку з кожнай дзесяціны зямлі [22].

Пры стварэнні ВіцТСГ сяляне Віцебскай губерні ахвяравалі грошы на развіццё сельскай гаспадаркі, сума была сабрана ініцыятарам стварэння ВіцТСГ П. Растоўцавым, які паклаў іх у банк для скарыстання ВіцТСГ па прызначэнні. Пазней было прынята рашэнне перадаць грошы ў памеры 20 тыс. руб. ВіцТСГ на адкрыццё земляробчай школы. Асноўны ўнёсак зрабілі ганаровыя члены таварыства Гуга Абранпольскі, Баляслаў Альшэўскі, а таксама былы намеснік старшыні ВіцТСГ Вацлаў Косаў [11, с. XXX–XXXV]. У 1892 г. членам ВіцТСГ і агентам Віленскага пазямельнага банка І. Шадурскім быў складзены «Очерк Витебской губернии в географическом, гидрографическим и почвенном отношении», дзе абгрунтоўвалася патрэба пашырэння сельскагаспадарчай адукацыі на Віцебшчыне.

Да справы далучаліся аграномы і энтамолагі (спецыялісты па насякомых) [9, с. 486–490]. Яшчэ ў 1891 г. ВіцТСГ атрымала права на набыццё маёнтка Лужэсна для стварэння тут земляробчай школы. Для гэтых мэт за 9 вёрст ад Віцебска была набыта 101 дзесяціна зямлі [11, с. XXX–XXXV]. Пры таварыстве былі адкрыты таксама масларобчыя курсы пад кіраўніцтвам урадавага інструктара А. Шахназарава [11, с. XXX–XXXV].

У Віцебскім павеце з 1894 г. існавала Зачарнянская ніжэйшая сельскагаспадарчая школа. У 1907 г. у Дрысенскім павеце была створана Малалісвідская практычная школа садаводства, а ў Віцебскім павеце Хрусталёўская школа садаводства, сыраварэння і масларобства, якую фінансавала ВіцТСГ і выплочвала стыпендыі яе навучэнцам [21].

У 1909 г. ВіцТСГ адкрыла Лужэснянскую сельскагаспадарчую школу з патрэбнай для распаўсюджвання сельскагаспадарчых ведаў інфраструктурай і правядзення на яе базе даследаванняў. Кіраўніцтва дзяржаўных маёмасцей было праінфармавана пра стварэнне на ферме Лужэсна ніжэйшай сельскагаспадарчай школы першай ступені [20].

Рэжыцкае павятовае сельскагаспадарчае таварыства праз рассылку брашур, асабістыя настаўленні і тлумачэнні членаў аддзела па са-

даводстве кансультавала ўладальнікаў садоў, як весці барацьбу з насякомымі, якія знішчалі пладовыя дрэвы.

З дапамогай апытальных аркушоў у Віцебскай губерні ў 1899 г. збіраліся звесткі аб стане малочнай гаспадаркі для прадстаўлення вынікаў на ўсерасійскай выставе малочнай справы і рассылкі землеўласнікам. У Віцебск запрашаліся спецыялісты па малочнай гаспадарцы і жывёлагадоўлі, якія чыталі лекцыі. Некаторыя лекцыі выпускаліся асобнымі брашурамі і распаўсюджваліся сярод зацікаўленых гаспадароў [20].

У Аршанскім павеце Магілёўскай губерні ў 1900 г. была створана Смалянская ніжэйшая сельскагаспадарчая школа [13]. У 1901 г. МагТСГ рэалізавала праект стварэння Зіноўеўскай практычнай школы садаводства ў Магілёўскім павеце. У 1910 г. вялікая частка бюджэта МагТСГ ішла на арганізацыю працы ў школе, што сведчыць аб фінансавых складанасцях таварыства ў гэты перыяд. Абмяркоўвалася магчымасць перадачы школы ў падпарадкаванне земства Магілёўскай губерні [19].

Супрацоўнічаў з МагТСГ і адзін з самых заможных памешчыкаў Сенненскага павета, член ВіцТСГ Фёдар фон Рэнтальн, уладальнік маёнтка «Ходцы». На працягу 27 год ён займаўся эксперыментамі па паляпшэнні беларускай свойскай жывёлы. Ён браў мясцовую пароду і скрыжоўваў яе з лепшымі асобінамі швейцарскай і галандскай пароды. Амаль 18 гадоў ён паляпшаў мясцовую пароду авечак, цалкам абнавіў статак на мясных англійскіх авечак [17, с. 31].

У ГродзТСГ спрэчкі аб адкрыцці ніжэйшай сельскагаспадарчай школы ў 1903 г. прывялі да высновы аб неабходнасці дадатковага фінансавання ініцыятывы [7].

У Віленскай губерні была свая сельскагаспадарчая навучальная ўстанова, Варанецкая ніжэйшая сельскагаспадарчая вучэльня, якая з'явілася ў 1909 г. на тэрыторыі Вілейскага павета і каштавала значнай часткі бюджэта ВілТСГ [16].

У 1912 г. Віленскім ТСГ была праведзена серыя экскурсій для сялян. Праходзілі курсы па жывёлагадоўлі пры павятовых і валасных сельскагаспадарчых таварыствах і земляробчых гуртках ВілТСГ [16].

## Выставы і конкурсы

У 1882 г. ВіцТСГ правяло дзве сельскагаспадарчыя выставы. Першая выстава адбылася 21–22 чэрвеня 1882 г. дзякуючы Міхаілу Іосіфавічу Шчыту каля станцыі Дрыса побач з яго маёнткам Шчанснопаль. Другая выстава праходзіла ў Віцебску 3–13 кастрычніка 1882 г., яна была больш маштабнай з вялікай колькасцю экспанатаў і прэміраваннем за лепшыя з іх, яе працу забяспечваў аграном Браніслаў Віктаравіч Шахно. За выдатную арганізацыю выставы Б. Шахно стаў ганаровым членам ВіцТСГ [11, с. XXX–XXXV].

Важнай падзеяй для МінТСГ сталі дзве сельскагаспадарчыя выставы, праведзеныя ў 1883 і 1884 г., якія паспрыялі папулярызацыі працы МінТСГ сярод землеўласнікаў і іх актыўнаму ўступленню ў таварыства [3, с. 267–268]. У 1884 г. ВіцТСГ арганізавала дзве спецыяльныя выставы для сялян. Выставы мелі валасны статус і ставілі перад сабой задачу стымуляваць развіццё гаспадаркі праз узнагароду сялян новымі тыпамі насення і прылад працы. Першая валасная выстава праходзіла 24 чэрвеня 1883 г. у маёнтку Сарыя, Дрысненскага павета, які належаў старшыні ВіцТСГ Станіславу Ігнатавічу Лапацінскаму. Ён стаў пачынальнікам традыцыі ўзнагароджання за экспанаты не толькі пахвальнымі лістамі і грашыма, але і земляробчымі прыладамі. Другая выстава прайшла ў маёнтку Заласем'е Себежскага павета пры падтрымцы мясцовага гаспадара Мікалая Аляксандравіча Тамілава [11, с. XXX–XXXV].

Асаблівай з'явай стала кустарная выстава плеценых кошыкаў, праведзеная М. Тамілавым пры Заласемскім пагосце. Фактычна ён адрадзіў дадзеную галіну кустарнай прамысловасці. А ў 1885 г. прайшла яшчэ адна выстава, на гэты раз праведзеная Ф. Ціханавецкім у Пасінскай воласці Люцынскага павета [4].

У 1893 г. МагТСГ удзельнічала ў конкурсе сельскагаспадарчых прылад, арганізаваным МінТСГ. У 1895 г. МагТСГ планавала правесці сельскагаспадарчую і прамыслова-кустарную выставу, але з-за пралікаў пры падрыхтоўцы вымушана было перанесці яе правядзенне на верасень 1896 г. Праблемы былі звязаны з недахопам сродкаў і часу. У выніку першая Магілёўская кустарная і сельскагаспадарчая выстава праходзіла з 5 па 16 верасня 1896 г., прыцягнула вялікую колькасць удзельнікаў і 1177 экспанатаў, што дазволіла абмяняцца дасягненнямі і распаўсюдзіць навацыі [6, с. 1–12].

У 1901 г. МінТСГ была праведзена сельскагаспадарчая выстава ў Мінску. За арганізацыю мерапрыемства адказваў граф Ежы Чапскі, які забяспечыў адпаведную інфраструтуру для правядзення выставы. Актыўны ўдзел прыняў сам старшыня МінТСГ Геранім Гутэн-Чапскі і яго намеснік Эдвард Вайніловіч. Былі збудаваны павільёны і падрыхтавана пляцоўка для правядзення мерапрыемства [2].

У Вільні з 30 жніўня па 8 верасня 1902 г. праходзіла сельскагаспадарчая і кустарна-прамысловая выставы, запрашэнні на якую пасылаліся кожнаму губернскаму сельскагаспадарчаму таварыству. Вынікам выставы сталі больш шчыльныя сувязі ВілТСГ з ВіцТСГ і МінТСГ [27, с. 221–239].

ВіцТСГ правяло ў 1903 г. у Дзвінску першы з'езд губернскіх землеўласнікаў. Нагодай для з'езда стала сельскагаспадарчая і прамысловая выстава з кустарным аддзелам. Праца з'езда падзялялася на чатыры секцыі паляводства, жывёлагадоўлі, садаводства, лесаводства [25, с. XX–XXVIII].

У кастрычніку 1905 г. на першым з'ездзе земскіх і гарадскіх дзеячаў у Маскве прынялі рашэнне правесці першую аўкцыённую выставу-кірмаш ў верасні 1906 г. У верасні 1906 г., як і планавалася, ВіцТСГ арганізавала выставу жывёлагадоўлі з кустарным аддзелам, спецыялізацыяй выставы было быдла і вырабы кустарнай прамысловасці [21].

У 1912 г. быў праведзены кірмаш у Вільні з удзелам іншых губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў. Былі прадстаўлены субсідыі кустарнай секцыі ВілТСГ для правядзення кустарнай выставы [16].

*Заключэнне.* Сацыяльна-эканамічная дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў была базавым кірункам як у адпаведнасці са статутнымі дакументамі, так і на практыцы. Такім чынам, можна сцвярджаць адпаведнасць задач, дэкларыраваных у статуце, рэальнай дзейнасці таварыстваў. Пры гэтым якасць выканання статутных задач рознымі таварыствамі адрознівалася і меліся адметнасці ў выбары прыярытэтных напрамкаў сацыяльна-эканамічнай дзейнасці. Узровень актыўнасці кожнага аб'яднання вар'іраваўся ў залежнасці ад аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.

Таварыствы часткова рэалізоўвалі ідэю самакіравання ў галіне сельскай гаспадаркі, але фінансавая залежнасць ад дзяржавы і неспрыяльная палітычная кан'юнктура не дазволілі ім актыўна развівацца ў гэтым кірунку. Палажэнні статута абумовілі яшчэ і бюракратычную залежнасць таварыстваў па сацыяльна-эканамічных пытаннях ад земляробчага ведамства.

Сацыяльна-эканамічная дзейнасць таварыстваў мела чатыры ключавыя напрамкі і розныя формы, якія дазволілі таварыствам ствараць устойлівую сістэму падтрымкі землеўласнікаў у рэгіёне, адносна развітую матэрыяльную базу і актывізаваць сацыяльна-эканамічныя сувязі паміж рознымі групамі насельніцтва. Гэта прывяло да інтэнсіфікацыі сацыяльна-эканамічнага развіцця на землях Беларусі і Літвы ў канцы XIX – пачатку XX ст.

*Літаратура*


1. *Jurkowski, R.* Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864–1904: działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski, Warszawa: Drukarnia Duo, 2001. – S. 15–30.
2. Kraj / W Minsku I okolicy // Dodatek nadzwyczajny do № 33, 1901. – S. 1–8.
3. *Romanowski, A.* Pozytywizm na Litwie: polskie z˙ycie kulturalne na ziemiach litewsko-bialorusko-inflanckich w latach 1864–1904. – S. 265-275.
4. *Киштымов, А. Л.* Беларусь на выставках XIX – начала XX в. : дис. канд. ист. наук : 07.00.02: / А. Л. Киштымов. – Минск, 2001.
5. Вся Россия: Русская книга промышленности, торговли, сельского хозяйства и администрации: Торгово-промышленный адрес-календарь Российской империи – СПб. : А. С. Суворин, 1902. – 325 с.
6. *Гамалей, А. А.* Первая Могилевская сельскохозяйственная и кустарно-промышленная выставка в городе Могилеве-на Днепре / А. А. Гамалей. – СПб., 1898. – 12 с.
7. Журнал обыкновенного общего собрания Гродненского общества сельскаго хозяйства 31-го мая 1902 г. – Гродно : Тип. К. Крамковскаго, 1902. – 8 с.
8. Журнал полугодичнаго общаго собрания членов Общества витебских сельских хозяев, 21–22 октября 1890 г. – Витебск : Тип. наследника М. Б. Неймана., 1890. – 12 с.
9. Записка Режицкаго Сельскохозяйственнаго Общества о нуждах сельскаго хозяйства уезда, с ответами по программе Высочайше учрежденнаго Особаго Совещания по пунктам / Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. V. Витебская губерния. – СПб. : Типо-литография В. Киршбаума, 1903. – С. 486–490.
10. Ковенский губернский комитет о нуждах сельскохозяйственной промышленности / Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. XVI. Ковенская губерния. – СПб. : Типография Т-ва «Народная польза», 1903. – С. 1–17.


*References*


1. *Jurkowski, R.* Ziemiaństwo polskie Kresów Północno-Wschodnich 1864–1904: działalność społeczno-gospodarcza / R. Jurkowski, Warszawa: Drukarnia Duo, 2001. – S. 15–30.
2. Kraj / W Minsku I okolicy // Dodatek nadzwyczajny do № 33, 1901. – S. 1–8.
3. *Romanowski, A.* Pozytywizm na Litwie: rolskie z˙ycie kulturalne na ziemiach litewsko-bialorusko-inflanckich w latach 1864–1904. – S. 265-275.
4. *Kishtymov, A. L.* Belarus' na vystavkah XIX – nachala XX v. : dis. kand. ist. nauk : 07.00.02: / A. L. Kishtymov. – Minsk, 2001.
5. Vsya Rossiya: Russkaya kniga promyshlennosti, torgovli, sel'skogo hozyajstva i administracii: Torgovo-promyshlennyj adres-kalendar' Rossijskoj imperii – SPb. : A. S. Suvorin, 1902. – 325 s.
6. *Gamalej, A. A.* Pervaya Mogilevskaya sel'skohozyajstvennaya i kustarno-promyshlennaya vystavka v gorode Mogileve-na Dnepre / A. A. Gamalej. – SPb., 1898. – 12 s.
7. Zhurnal obyknovennogo obshchego sobraniya Grodnenskogo obshchestva sel'skago hozyajstva 31-go maya 1902 g. – Grodno : Tip. K. Kramkovskago, 1902. – 8 c.
8. Zhurnal polugodichnago obshchago sobraniya chlenov Obshchestva vitebskih sel'skih hozyaev, 21–22 oktyabrya 1890 g. – Vitebsk : Tip. naslednika M. B. Nejmana., 1890. – 12 s.
9. Zapiska Rezhickago Sel'skohozyajstvennago Obshchestva o nuzhdah sel'skago hozyajstva uezda, s otvetami po programme Vysochajshe uchrezhdennago Osobago Soveshchaniya po punktam / Trudy mestnyh komitetov o nuzhdah sel'skohozyajstvennoj promyshlennosti. V. Vitebskaya guberniya. – SPb. : Tipo-litografiya V. Kirshbauma, 1903. – S. 486–490.
10. Kovenskij gubernskij komitet o nuzhdah sel'skohozyajstvennoj promyshlennosti / Trudy mestnyh komitetov o nuzhdah sel'skohozyajstvennoj promyshlennosti. HVI. Kovenskaya guberniya. – SPb. : Tipografiya T-va "Narodnaya pol'za", 1903. – S. 1–17.

11. *Лилье, Е.* Краткий исторический очерк двадцатипятилетней деятельности Общества Витебских сельских хозяев / Е. Лилье // Труды первого областного съезда хозяев в гор. Двинске в 1903 г. – Витебск : Губернская Типо-литография, 1904. – С. XXX–XXXV.
12. *Липинский, Л. П.* Столыпинская аграрная реформа в Белоруссии. / Л. П. Липинский. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – С. 29–32.
13. *Новик, Н. Е.* Деятельность сельскохозяйственных обществ Беларуси по развитию профессионального образования (последняя четверть XIX – начало XX в.) / Беларусь, Капыльшчына і Эдвард Вайніловіч : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. – Минск : медысонт, 2016. – С. 219–245.
14. Нормальный устав сельскохозяйственного товарищества 1897 г. / Штаты и табели к Полному собранию законов Российской империи. Т. 17 (1897 г.). – СПб., 1907. – С. 319–325.
15. Обзор Могилевской губернии за 1909 г. Могилев, 1910. – С. 1–15.
16. Отчет Виленскаго общества сельскаго хозяйства за 1912 г. и Общий денежный отчет Воронецкаго сельскохозяйственнаго училища Виленскаго общества сельскаго хозяйства за 1912 г. – Вильно : Znicz, 1913. – 28 с.
17. Отчет Могилевскаго общества сельскаго хозяства за 1888 г. – Могилев на Днепре : Типолит. Я. Н. Подземскаго, 1890. – 4 с.
18. Отчет Могилевскаго общества сельскаго хозяства за 1894 г. – Могилев : Тип. губ. правл., 1895. – 26 с.
19. Отчет Могилевскаго общества сельскаго хозяства за 1910 г. с приложением отчета Зиновьевской практической школы садоводства – Могилев на Днепре : Типолит. Я. Н. Подземскаго, 1911. – 25 с.
20. Отчет о действиях Общества Витебских сельских хозяев за 1899 г. – Вильно : Тип. Иосифа Завадзкаго, 1900. – 48 с.
21. Отчет о действиях Общества Витебских сельских хозяев за 1905 г. – Витебск : Типолит. Подземскаго, 1906. – 88 с.
22. Паказны хутар «Бабоўня». Аб гаспадарцы на хутары і на шнурох // Наша Ніва. 1909. – № 6 і 7.
23. Письма Мейштовича Александра Эдуардовича Столыпину П. А. [Дело]: 30 окт. 1901 г. – 15 марта 1902 г. – 1901–1902. – 11 л.. – (Фонд Столыпин Петр Аркадьевич (1862–1911), Министр внутренних дел, Председатель Совета Министров. Опись № 1). – Ориг. заголовок дела: Письма Мейштовича Александра Эдуардовича к Столыпину: 1902 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.prlib.ru/item/357412 – Дата доступу: 15.09.2020.
24. Письмо Столыпина П. А. к Мейштовичу А. Э. [Дело]: 1902 г. – 1902. – 4 л. – (Фонд Столыпин Петр Аркадьевич (1862–1911), Министр внутренних дел, Председатель Совета Министров. Опись № 1) . – Рукописн. текст, чернила. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.prlib.ru/item/357527. – Дата доступу: 15.09.2020.
25. Положение о 1-ом областном съезде сельских хозяев в гор. Двинске в 1903 г. / Труды первого областного съезда хозяев в гор. Двинске в 1903 г. – Витебск : Губернская Типо-литография, 1904. – С. XX–XXVIII.
26. Справочные сведения о сельскохозяйственных обществах по данным на 1915 год / Справочно-издательское бюро при Департаменте земледелия под ред. В. В. Морачевского. – Петроград : Типография В. О. Киршбаума, 1916.
27. Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. XI. Гродненская губерния. – СПб. : Типо-литография Н. Евстафьева, 1903. – С. 221–239.
28. Устав Виленского общества сельского хозяйства, Вильно : Znicz, 1899. – С. 1–5.
29. Устав Витебского общества сельского хозяйства, СПб. : Губернская типография, 1876. – С. I–VIII.
30. Устав Минского общества сельского хозяйства, СПб. : Губернская типография, 1876. – С. 1–7.

11. *Lil'e, E.* Kratkij istoricheskij ocherk dvadcatipyatiletnej deyatel'nosti Obshchestva Vitebskih sel'skih hozyaev / E. Lil'e // Trudy pervogo oblastnogo s"ezda hozyaev v gor. Dvinske v 1903 g. – Vitebsk : Gubernskaya Tipo-litografiya, 1904. – S. XXX–XXXV.
12. *Lipinskij, L. P.* Stolypinskaya agrarnaya reforma v Belorussii. / L. P. Lipinskij. – Minsk : Izd-vo BGU, 1978. – S. 29–32.
13. *Novik, N. E.* Deyatel'nost' sel'skohozyajstvennyh obshchestv Belarusi po razvitiyu professional'nogo obrazovaniya (poslednyaya chetvert' HIH – nachalo HH v.) / Belarus', Kapyl'shchyna i Edvard Vajnilovich : materyyaly Mizhnar. navuk.-prakt. kanf. – Minsk : medysont, 2016. – S. 219–245.
14. Normal'nyj ustav sel'skohozyajstvennogo tovarishchestva 1897 g. / Shtaty i tabeli k Polnomu sobraniyu zakonov Rossijskoj imperii. T. 17 (1897 g.). – SPb., 1907. – S. 319–325.
15. Obzor Mogilevskoj gubernii za 1909 g. Mogilev, 1910. – S. 1–15.
16. Otchet Vilenskago obshchestva sel'skago hozyajstva za 1912 g. i Obshchij denezhnyj otchet Voroneckago sel'skohozyajstvennago uchilishcha Vilenskago obshchestva sel'skago hozyajstva za 1912 g. – Vil'no : Znicz, 1913. – 28 s.
17. Otchet Mogilevskago obshchestva sel'skago hozyastva za 1888 g. – Mogilev na Dnepre : Tipolit. Ya. N. Podzemskago, 1890. – 4 s.
18. Otchet Mogilevskago obshchestva sel'skago hozyastva za 1894 g. – Mogilev : Tip. gub. pravl., 1895. – 26 s.
19. Otchet Mogilevskago obshchestva sel'skago hozyastva za 1910 g. s prilozheniem otcheta Zinov'evskoj prakticheskoj shkoly sadovodstva – Mogilev na Dnepre : Tipolit. Ya. N. Podzemskago, 1911. – 25 s.
20. Otchet o dejstviyah Obshchestva Vitebskih sel'skih hozyaev za 1899 g. – Vil'no : Tip. Iosifa Zavadzkago, 1900. – 48 s.
21. Otchet o dejstviyah Obshchestva Vitebskih sel'skih hozyaev za 1905 g. – Vitebsk : Tipolit. Podzemskago, 1906. – 88 s.
22. Pakazny hutar «Baboŭnya». Ab gaspadarcy na hutary i na shnuroh // Nasha Niva. 1909. – № 6 i 7.
23. Pis'ma Mejshtovicha Aleksandra Eduardovicha Stolypinu P. A. [Delo]: 30 okt. 1901 g. – 15 marta 1902 g. – 1901–1902. – 11 l.. – (Fond Stolypin Petr Arkad'evich (1862–1911), Ministr vnutrennih del, Predsedatel' Soveta Ministrov. Opis' № 1). – Orig. zagolovok dela: Pis'ma Mejshtovicha Aleksandra Eduardovicha k Stolypinu: 1902 g. [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://www.prlib.ru/item/357412 – Data dostupu: 15.09.2020.
24. Pis'mo Stolypina P. A. k Mejshtovichu A. E. [Delo]: 1902 g. – 1902. – 4 l. – (Fond Stolypin Petr Arkad'evich (1862–1911), Ministr vnutrennih del, Predsedatel' Soveta Ministrov. Opis' № 1) – Rukopisn. tekst, chernila. [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://www.prlib.ru/item/357527. – Data dostupu: 15.09.2020.
25. Polozhenie o 1-om oblastnom s"ezde sel'skih hozyaev v gor. Dvinske v 1903 g. / Trudy pervogo oblastnogo s"ezda hozyaev v gor. Dvinske v 1903 g. – Vitebsk : Gubernskaya Tipo-litografiya, 1904. – S. XX–XXVIII.
26. Spravochnye svedeniya o sel'skohozyajstvennyh obshchestvah po dannym na 1915 god / Spravochno-izdatel'skoe byuro pri Departamente zemledeliya pod red. V. V. Morachevskogo. – Petrograd : Tipografiya V. O. Kirshbauma, 1916.
27. Trudy mestnyh komitetov o nuzhdah sel'skohozyajstvennoj promyshlennosti. HI. Grodnenskaya guberniya. – SPb. : Tipo-litografiya N. Evstaf'eva, 1903. – S. 221–239.
28. Ustav Vilenskogo obshchestva sel'skogo hozyajstva, Vil'no : Znicz, 1899. – S. 1–5.
29. Ustav Vitebskogo obshchestva sel'skogo hozyajstva, SPb. : Gubernskaya tipografiya, 1876. – S. I–VIII.
30. Ustav Minskogo obshchestva sel'skogo hozyajstva, SPb. : Gubernskaya tipografiya, 1876. – S. 1–7.